# Кантакты і дыялогі

## 5 1998

Ушанаванне памяці Адама Багдановіча



Болбас В.С. На скрыжаванні еўрапейскіх павеваў.
С. 3–7.

Заснавальнікі:
**Міжнародная асацыяцыя беларусістаў,**
**Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі**

Рэдкалегія:
**Эдуард ДУБЯНЕЦКІ (намеснік рэдактара),**
**Уладзімір КОНАН,**
**Ніна ІВАНОВА,**
**Адам МАЛЬДЗІС (рэдактар),**
**Генадзь ЦЫХУН,**
**Захар ШЫБЕКА**

Выдавецка-тэхнічная група:
**Таццяна ВАШКЕВІЧ,**
**Наталля ДАВЫДЗЕНКА,**
**Юрась ЖАЛЕЗКА,**
**Яраслаў МАЛЬДЗІС,**
**Тамара ШКУРКО**

Адрас рэдакцыі:
**Рэспубліка Беларусь, 220050, Мінск,**
**вул. Рэвалюцыйная, 15, Камітэт МАБ**

Тэлефон/факс:
**+375 (017) 220 93 50**

E-mail:
**mab@lingvo.minsk.by**

Электронны варыянт у InterNet:
**http://www.lingvo.minsk.by/mab/k&d.html**

*На першай старонцы вокладкі —*
**бюст Адама Багдановіча, бацькі Максіма Багдановіча (скульптар Уладзімір Лятун), быў адкрыты 29 мая на яго радзіме, у Халопенічах Мінскай вобл. стараннямі клуба "Спадчына" на чале з Анатолем Белым. А бронзавы эскіз бюста да гэтага быў урачыста перададзены музею Максіма Багдановіча ў Яраслаўлі Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам у час візіту туды ў маі 1998 г.**

Бюлетэнь выдаецца і высылаецца толькі тым сябрам МАБ, якія ўнеслі складкі.

Памер складак у месяц (з 1998 г.): у Беларусі — **15 тысяч рублёў**, у краінах СНД — **2 USD**, Цэнтральнай Еўропы — **3 USD**, Заходняй Еўропы, Азіі, на іншых кантынентах — **5 USD**.

Перыядычнасць выхаду — **1 нумар у месяц**.

Мовы выдання — беларуская і ў перспектыве — англійская, руская.

Паведамленні аб уплаце складак просім дасылаць на адрас рэдакцыі.

Складкі просім пераводзіцьаднаму з заснавальнікаў бюлетэня — **Камітэту Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.**

Банкаўскія рахункі:
**рублёвы — 3015205833015**
**у філіяле "Акадэмічны" КБ "Поиск", г. Мінск, код 730;**
**валютны — 3015250355004 у АКБ "Поіск", г.Мінск, код 782.**



*Валерый Болбас (Мазыр)*

## НА СКРЫЖАВАННІ ЕЎРАПЕЙСКІХ ПАВЕВАЎ: МАРАЛЬНЫ ІДЭАЛ У ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

**Валерый Болбас** — дацэнт Мазырскага педагагічнага інстытуту, аўтар прац па гісторыі адукацыі і філасофскай думкі ў Беларусі. У аснове артыкула — тэкст даклада, прысланага на канферэнцыю па грамадскіх ідэалах, якая не адбылася.

Характэрнай асаблівасцю творчасці беларускіх мысліцеляў XVI–XVII стст., якія спрабавалі знайсці тлумачэнне тагачаснай рэчаіснасці, быў адыход ад сацыяльных у этычныя абсягі. Незадаволенасць рэальнасцю, імкненне да новай арганізацыі жыцця, сацыяльнага прагрэсу падштурхоўвала да пошуку шляхоў маральнага ўдасканалення грамадства. Большасць мысліцеляў першараднай і важнейшай умовай паспяховага ажыццяўлення такой задачы лічылі маральнае выхаванне.

Найбольш трапна выказаў такія думкі паэт-лацініст Мікола Гусоўскі, чыя спадчына належыць беларускаму і польскаму народам. Ён ўвесь час задумваўся над прычынамі невысокага ўзроўню маральнасці ў грамадстве, над нетрываласцю веры і спрабаваў знайсці карані зла. Нават Хрыстос, якога Бог паслаў на зямлю дзеля ўратавання людзей, "усё ж не здолеў навесці іх на праведны шлях угаворамі" (1). Асноўнай прычынай такой няўдачы мысліцель лічыў адсутнасць бачнай, канкрэтнай мэты: "Верылі людзі, але чакалі, ці з'явіцца мэта, ці можна будзе прычыны ўбачыць" (2).

Ян Ліцыній Намыслоўскі, польска- і лацінамоўны педагог і паэт, таксама разумеў важнасць мэтанакіраванасці ў любым родзе дзейнасці, у тым ліку ў выхаванні дзяцей. У сваім вучэбным дапаможніку па этыцы ён пісаў: "Не, не бярыся ўсляпую што-небудзь рабіць, даследуй прычыны, потым прадумай мэту, а будзеш заўсёды не ў крыўдзе" (3).

Актуальнай і сёння з'яўляецца думка Сімяона Полацкага, дзеяча беларуска-руска-ўкраінскага "пагранічча", аб тым, што калі пачынаеш штосьці рабіць, то варта загадзя прадбачыць той вынік, да якога ідзеш: "Егда хощеши дело начинати, конец первее требе разсуждати" (4). Такія думкі айчынных педагогаў давалі адчувальны штуршок для арыентацыі этыка-педагагічнай думкі ў накірунку глыбокай і ўдумлівай распрацоўкі маральна-выхаваўчых прынцыпаў.

Пераасэнсаванне ролі маральнага выхавання ў арганізацыі грамадскага жыцця наогул і ў станаўленні кожнай асобы ў прыватнасці дапамагло Францыску Скарыне і яго паслядоўнікам адрадзіць і напоўніць новым сэнсам галоўную выхаваўчую мэту, якая ў свой час была абгрунтавана дзеячамі антычнай культуры і

ранняга хрысціянства. Сэнс яе выяўляўся ў славутай формуле “калакагатхіі”, або “калакагатыі”, якая мела на ўвазе прыгажосць духоўных і фізічных адносін. Аказаўшы вызначальны ўплыў на выхаваўчыя дактрыны старажытнасці, яна была адкінута сярэдневякоўем і доўгія стагоддзі знаходзілася ў забыцці. Францыск Скарына быў у ліку тых рэнесансных дзеячаў, хто здолеў разгледзець у гэтай ідэі шлях да гарманічнага развіцця чалавека згодна з асноўнымі пастулатамі хрысціянскай веры.

“Да совершенен будет человек Божий и на всяко дело добро уготован, яко святый апостол Павел пишеть” (5), — так характарызаваў асноўную мэту выхавання Францыск Скарына. Прычым дасканаласць разумелася асветнікам найперш як маральна-духоўная дасканаласць. У адной са сваіх прадмоў ён, згодна з Саламонам, прама расшыфраваў гэтае паняцце: “Бога бойся и заповеди его соблюди, той ест воистину совершенный человек” (6). Такім чынам, у якасці маральнага ідэала ў Францыска Скарыны выступае дасканалая, маральная асоба з высокім узроўнем духоўнасці, інтэлекту. Такое паняцце ідэала чалавека, з улікам арыентацыі на жыццёвыя рэаліі навакольнай рэчаіснасці, было прынцыпова новым у параўнанні з ранейшым, сярэдневяковым аскетызмам і дагматыкай.

Тэарэтычная спадчына Францыска Скарыны ўключае шэраг вобразаў біблейскіх персанажаў, якія, на яго думку, і ўяўлялі сабой ідэал чалавечай дасканаласці. Для нас важна, што галоўным крытэрыем іх адбору беларускі першадрукар лічыў маральныя якасці.

Прысутнасць сацыяльна-значных арыенціраў, усведамленне неабходнасці высокамаральных паводзін, на думку Міколы Гусоўскага, — першачарговая і неабходная ўмова развіцця кожнай асобы. Таму аўтар “Песні пра зубра” імкнуўся дзеля выхаваўчай мэты стварыць ідэальныя вобразы як прадстаўніка асобных саслоўяў, так і чалавека наогул. Да прыкладу, узорам дзяржаўнага мужа з’яўляецца для паэта асоба, надзеленая такімі рысамі, як разумнасць, высакароднасць, справядлівасць, патрабавальнасць, ваяўнічасць, суровасць, чуласць да падначаленых.

Даследчыкі адзначаюць, што Мікола Гусоўскі ў сваёй паэме ачалавечвае зубра. Надзяляе яго душой, гонарам, сумленнем. Вобраз лясного волата, увасабленне сілы, мужнасці, высакароднасці, быццам дапаўняе асобныя якасці ідэалізаванага князя. Працяг стварэння маральнага ідэала бачыцца ў персанажах простых людзей — кемлівых, спрытных, смелых, адданых сваёй радзіме. Чалавекалюбства, якое ўздымаецца да самаахвяравання ў імя людзей, уносіць у сінтэтычны ідэальны вобраз асоба Іякінфа з аднайменнай паэмы. Завяршае гэтую галерэю партрэт аўтара, лірычнага героя паэмы “Песня пра зубра”, высокаадукаванага, гуманістычна выхаванага, дэмакратычна настроенага чалавека, патрыёта сваёй радзімы. Выпісаны такім чынам мастацкі вобраз ідэальнай асобы ўвабраў у сябе шырокую палітру агульнаеўрапейскіх каштоўнасна-маральных адносін да свету, увасобіў этыку грамадзянскага служэння народу, акрэсліў пошукі выхаду з тагачаснага (ды і сённяшняга) маральнага выраджэння.



Сымон Будны, цесна звязаны з польскімі і заходнееўрапейскімі мысліцелямі, лічыў, што асноўныя арыенціры маральнага выхавання вызначаны ў дзесяці запаведзях, чатыры з якіх вучаць, як трэба адносіцца да Усявышняга, а астатнія шэсць маюць на мэце стварэнне асновы ўзаемаадносін паміж людзьмі. Сукупнасць гэтых запаведзяў, на думку тэолага, утварае вышэйшы маральны закон, у якім людзі павінны бачыць свой духоўны арыенцір, што дапаможа дасягнуць больш высокай ступені дасканаласці. “Просто не для того Бог дал закон, абы и человек выполнити мог, але наболеи, абы познал и обачил недостаток свой. А обозначивши, абы у собе не уповал, але бы где инде лекарства и спасенья искал” (7).

Вызначаючы ў якасці галоўнай мэты маральнага выхавання фарміраванне дасканалага чалавека, Сымон Будны гэтае паняцце трактаваў значна шырэй, чым яго папярэднікі. Як і ў іншых паслядоўнікаў Францыска Скарыны, маральны ідэал, ва ўяўленні Буднага, гэта — дабрачынная, адукаваная, рознабакова развітая асоба. Падкрэсліваючы, што фарміраванне яе павінна грунтавацца на шматбаковым развіцці, асветнік пісаў: “Нехай учатся християне наук потребных, яко писанию, богословию... лекарству и иншим почтивым наукам” (8). Не спыняючыся на гэтым, ён узнімае ідэал маральнай дасканаласці на якасна новую ступень, дапаўняючы яго рысамі свабодных, крытычных адносін да рэчаіснасці з непамерна больш высокім пачуццём уласнай годнасці.

Сымон Будны не ставіў пад сумненне саслоўныя адрозненні, але ўсё ж зыходзіў з прыроднай роўнасці людзей. Ён абгрунтоўваў думку, што ў любых слаях грамадства могуць быць людзі з высокім інтэлектуальна-маральным узроўнем. “Майце на ўвазе, — адзначаў ён, — што і гандляр зелянінай, бывае, гаворыць правільна” (9). Беларускі мысліцель нават сцвярджаў, што чалавек можа пераходзіць з аднаго саслоўя ў другое, а прадстаўнікі знаці не павінны прэтэндаваць на выключнасць у грамадстве таму, “што яны такія ж, як і іншыя людзі”. Наадварот, маральна дасканалы чалавек у разуменні беларускіх мысліцеляў эпохі Адраджэння — гэта асоба, якая з павагай і прыхільнасцю адносіцца да простых людзей, аказвае апошнім усялякую дапамогу, аблягчаючы іх гаротнае становішча.

Дэмакратычны аспект у разуменні грамадскага ідэала выразна праяўляўся ў вуснай народнай творчасці. Часта сярод яе герояў сустракаюцца і царэвічы, і каралевічы, але калі з’яўляецца Іван — сялянскі сын, то ён абавязкова больш разумны, кемлівы і дужы. Наогул, просты мужык і лесавіка не спалохаецца, і з чортам справіцца, і з бабай-ягой паладзіць, і пана перахітрыць.

У адпаведнасці з традыцыямі народнай педагогікі, якія падмацоўваліся хрысціянскім веравучэннем, у мэтавых установках тагачаснага маральнага выхавання значнае месца займаў аспект грамадскай арыентацыі. Трэба адзначыць, што наогул этыка-педагагічныя ідэі беларусаў, як і іншых усходніх славян, у параўнанні з поглядамі жыхароў Заходняй Еўропы, вызначаюцца большай скіраванасцю да супольнасці, агульнага дабра.

Пры сцвярджэнні годнасці і самакаштоўнасці кожнага чалавека беларускія мысліцелі XVI ст. у процівагу хрысціянскаму касмапалітызму сярэдневякоўя не маглі не ўсведамляць неабходнасць усталявання ў людзей пачуццяў гонару, любові да Радзімы, яе народа. Педагогі-асветнікі лічылі, што натуральная сувязь людзей з "мілай старонкай", "родным куточкам" не толькі не перашкаджае, а наадварот, павінна ўмацоўваць унутраную маральна-духоўную пазіцыю выхаванцаў. Гэтым значна паглыбляліся і дапаўняліся мэты маральнага выхавання, істотна ўзбагачаўся маральны ідэал у тагачаснай педагагічнай думцы Беларусі.

Мысліцелі Беларусі эпохі Адраджэння гуманістычна пераасэнсоўвалі і перапрацоўвалі ідэалы хрысціянскай этыкі дзеля ўдасканалення зямнога жыцця і пры гэтым падкрэслівалі, што ўсе мэты маральнага выхавання павінны зыходзіцца на выхаванні дзейснай, актыўнай асобы. Яны падвяргалі сумненню арыстоцелеўскае разуменне самамэтнасці дабрачыннасці. Кожная маральнасць, якая не пераходзіць у рэальныя, практычныя справы, нічога не варта ці, як пагаджаўся Францыск Скарына з хрысціянскімі запаветамі, — "...вера бо без дел мертва ест" (10).

Такім чынам, паняцце маральнага ідэала, якое выказвалася ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння, брала пачатак у народна-выхаваўчых поглядах, ідэях і назапашаным вопыце, грунтавалася на антычным уяўленні аб гарманічным развіцці асобы, скрозь і цалкам было прасякнута ідэямі хрысціянскай этыкі. Такі ідэал даволі выразна выяўляў сукупнасць этычных каштоўнасцей, якія былі прымальнымі для тагачаснага грамадства, а многія з іх не згубілі сваёй значнасці і да сённяшняга дня.

---

(1) Парэцкі Я. І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццё Іякінфа" // Бел. літаратура і літаратуразнаўства: Міжвуз. зб. Мн., 1974. Вып. 2. С. 173.
(2) Тамсама.
(3) Парэцкі Я. І. Іўеўскі педагог Ян Ліцыній Намыслоўскі // Бел. літаратура. Мн., 1983. Вып. 11. С. 181.
(4) Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX в. Мн., 1962. С. 260.
(5) Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., 1990. С. 17.
(6) Тамсама. С. 26.
(7) Будный С., Крышковский Л., Кавечинский М. Катихисис то ест наука стародавная христианьская, от светого писма для простых людей языка руского, в пытаниах и отказех събрана. Несвиж, 1562. С. 103 адв.
(8) Тамсама. С. 61–62 адв.
(9) Тамсама. С. 63.
(10) Скарына Ф. Творы. С. 105.



*Лявон Юрэвіч (Нью-Йорк, ЗША)*

## ЛІТАРАТУРНЫ РУХ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Творы пісьменнікаў-эмігрантаў афіцыйна прыйшлі да шырокага чытача ў Беларусі напрыканцы 80-х гадоў, калі ў перыядычным друку з'явіліся першыя нізкі вершаў, пачалі публікавацца звесткі пра іх аўтараў.

За мінулы час зроблена нямала ў справе азнаямлення і асэнсавання літаратуры беларускага замежжа: надрукаваны цыклы артыкулаў, прысвечаныя эмігранцкай літаратуры (часопіс "Роднае слова" за 1993 г.), першыя манаграфічныя артыкулы пра асобных пісьменнікаў. Створаны альманах "Культура беларускага замежжа" (рэдактар А. Сабалеўскі), у выдавецтве "Мастацкая літаратура" заснавана серыя "Галасы беларускага замежжа" (ініцыятар пісьменнік У. Арлоў). Сярод аўтараў гэтых даследаванняў трэба назваць найперш імёны Барыса Сачанкі, Міколы Мішчанчука, Лідзіі Савік. Ацэнкі, натуральна, розніліся — ад апалагетыкі твораў да іх поўнага непрыняцця, але галоўнае — творы пісьменнікаў-эмігрантаў пачалі ўводзіцца ў кантэкст беларускай літаратуры.

**Лявон Юрэвіч** — даследчык гісторыі беларускай літаратуры (найперш — эмігранцкай). Супрацоўнічае з Беларускім інстытутам навукі і мастацтва (Нью-Йорк). У аснову артыкула пакладзены тэкст даклада, прачытанага на навуковай канферэнцыі ў Любліне (Польшча).

У прыгаданых публікацыях жыццяпіс і творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў падаюцца звычайна ў вертыкалі — ад нараджэння (у Беларусі) да апошніх твораў (на эміграцыі). За рэдкім выключэннем, адсутнічае спроба гарызантальнага аналізу, як і спроба прасачыць такія сувязі і ўплывы, як пісьменнік — часопіс, пісьменнік — грамадская арганізацыя, пісьменнік — выдавецтва, пісьменнік — чытач і г. д.

Сёння з'явілася патрэба асэнсаваць літаратуру, створаную за межамі Бацькаўшчыны, як арганічную частку беларускай літаратуры, а не яе адгалінаванне, не як асобную плынь, і ўбачыць літаратуру замежжа не як дзейнасць асобных пісьменнікаў на эміграцыі, а як літаратурны рух. Адзначым, што аналізу падлягае літаратурны рух паваеннай хвалі беларускай эміграцыі, бо яна, найбольш колькасная, стварыла свае духовыя каштоўнасці, у тым ліку і літаратуру, знаходзячыся ў лагерах ДП і асноўных краінах рассялення — Нямеччыне, ЗША, Англіі, Канадзе, Францыі, Аўстраліі.

Што мы маем у наяўнасці — гэта часавы прамежак 1945–1990 гг., і можам паспрабаваць даць поўную характарыстыку гэтай літаратуры, у першую чаргу, у ЗША.

1. Неаднаразова згаданая "патрэба напісання гісторыі беларускай літаратуры на эміграцыі" ўяўляецца сёння не толькі немагчымай, але ад пачатку няправільнай ідэяй.

Перш за ўсё, літаратура замежжа стваралася пераважна людзьмі, творчая дзейнасць якіх пачалася на Бацькаўшчыне, задоўга да эміграцыі. Гэта, да прыкладу, добра вядомыя яшчэ да вайны Наталля Арсеннева, Юрка Віцьбіч, Антон